# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## ПАКАШТУЙЦЕ!

### Салата «Хрусткая»

***Спатрэбіцца:** 200 г белага хлеба, 250 г курынага філе, 150 г сыру, 300 г агуркоў, 150 г цыбулі, 1 пучок зялёнай салаты. Запраўка: 4 ст.л. алею, 3 зубчыкі часнаку, 1 ст.л. воцату, соль, перац.*

Адварыце філе да гатоўнасці (варыце каля 20 хвілін пасля закіпання). Затым астудзіце мяса і разбярыце яго на валокны. Нарэжце кубікамі батон і абсмажце яго да залацістага колеру. Агуркі нарэжце саломкай. Таксама нарэжце паўкольцамі цыбулю. Калі яна вельмі горкая, то заліце кіпенем, пакіньце на 10 хвілін, потым зліце ваду, прамыйце цыбулю ў халоднай вадзе. Сыр надзярыце на сырнай тарцы. Для запраўкі трэба змяшаць воцат, соль, алей, перац, здробнены часнок. Лісце салаты можна парваць рукамі. Затым дабаўце агуркі, філе курыцы, цыбулю, сыр і запраўку.



Перад самай падачай на стол пасыпце сухарыкі, гэта дазволіць ім заставацца хрусткімі.

### Курыныя дранікі

***Спатрэбіцца:** грудка курыная — 400 г, бульба — 2 шт., морква — 1 шт., яйка — 1 шт., малако — 100 мл, соль — 0,5 ч. л., перац духмяны — 0, 25 ч. л., алей — 4 ст. л.*

З курынай грудкі зрабіць фарш. Дабавіць соль, перац, яйка і малако. Добра змяшаць.

Затым дабавіць моркву, надзёртую на дробнай тарцы, і бульбу, надзёртую на буйной. Добра перамяшаць. Фарш гатовы.



На змазаную разагрэтую патэльню наліць трохі алею і выкладваць фарш лыжкай у выглядзе аладак, абсмажваць з двух бакоў хвілін па 5-7. Затым усе курыныя дранікі пакласці ў патэльню, на якой яны смажыліся, накрыць вечкам і патрымаць на пліце некалькі хвілін.

## РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА!

**Падоўжыць тэрмін прыдатнасці малочных прадуктаў**

Змясціце мяккі сыр, вяршкі або смятану ў герметычны кантэйнер, а затым перавярніце яго. Такім чынам утвараецца вакуум, які прадухіляе размнажэнне бактэрый.

**Змякчыць цвёрдае мяса**

Каб мяса стала менш цвёрдым, прамарынуйце буйныя кавалкі ў піве ці воцаце, цытрусавым, таматным або ананасавым соку. Калі гэта не дапаможа, лёгенька прайдзіцеся па кавалачках кухонным малатком.

**Каб садавіна даспела**

Пакладзіце яе на ноч разам з адным яблыкам у папяровы пакет.

## РАМОНТ СВАІМІ РУКАМІ

### Чым пафарбаваць столь

Для афарбоўкі лепш выкарыстоўваць водаэмульсійныя фарбы. Чаму менавіта іх? Водна-дысперсійныя фарбы маюць у якасці асновы звычайную ваду. Раз так, памяшканне не будзе насычацца пахамі таксічных растваральнікаў. Хутка высахнуць. Мы атрымаем цалкам гатовую столь не пазней чым на наступны дзень. Чаму фарбы называюцца водаэмульсійнымі? Кажучы больш спрошчана, фарба складаецца з вады і шарыкаў пігменту са звязваючым, якія плаваюць у ёй. Пасля выпарэння вады гэтыя шарыкі, зліпы, утвараюць раўнамернае і трывалае пакрыццё. Менавіта ўласцівасці звязваючага ў вялікай ступені вызначаюць уласцівасці самой фарбы.

Водаэмульсійныя фарбы бываюць сілікатныя, мінеральныя, акрылавыя, на латэкснай аснове, з дабаўленнем сілікону.

**Якую фарбу выбраць?**

Для кухні з яе сажай і тлушчам адназначны выбар — фарбы на акрыла-сіліконавай аснове. Укладанне грошай у дарагую фарбу акупіцца з лішкам: паўторны рамонт пры выкананні ўсіх рэкамендацый вытворцы прыйдзецца рабіць не хутка. Сіліконавая водаэмульсійка падыходзіць нават для вонкавых работ.



Для санвузлоў выдатна падыдуць латэксныя водаэмульсійныя фарбы. Зразумела, прыйдзецца шліфаваць столь перад іх нанясеннем. Акрылавая фарба будзе найлепшым выбарам для жылых пакояў. Яна забяспечыць разумны баланс паміж спажывецкімі якасцямі і коштам рамонту.

**Як пафарбаваць?**

Перадусім аснoўныя тонкасці нанясення фарбы. Перад афарбоўкай паверхня абавязкова грунтуецца. Грунтоўка палепшыць счапленне фарбы са столлю і паменшыць яе расход. У вільготных памяшканнях перад апрацоўкай прыпакінальнай грунтоўкай варта нанесці на столь грунтоўку антысептычную. Яна папярэдзіць з'яўленне грыбка.

Столь фарбуецца двума максімальна тонкімі слаямі. Інструмент — валік з доўгім ворсам. Слаі кладуцца перпендыкулярна адзін аднаму, пры гэтым апошні кладзецца ў кірунку ад акна.

Пры афарбоўцы ў два слоі лепш прытрымлівацца такой схемы.

Валік абавязкова раскочваецца, прычым не на столі. Спатрэбіцца малярны латок або проста ліст кардону.

Усё памяшканне фарбуецца ў адзін прыём, без доўгіх паўзаў. У адваротным выпадку мяжа пакрыцця, якое паспела падсохнуць, будзе відаць.

Каб убачыць дэфекты і няроўнасці слоя, які наносіцца, зрабіце пару крокаў убок. Пад прамым вуглом яны дрэнна відаць. Калі вы ўбачылі непафарбаваны ўчастак на столі, якая падсыхае, — не спрабуйце выправіць гэты слой. Дачакайцеся поўнага яго высыхання і нанясіце яшчэ адзін слой фарбы.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.41 | 17.03 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.39 | 17.20 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.31 | 17.03 |
| Гомель — | 4.34 | 21.18 | 16.44 |
| Гродна — | 4.55 | 21.55 | 17.00 |
| Брэст — | 5.05 | 21.46 | 16.41 |

**Месяц**

*Маладзік 05.06–11.06.*

*Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**

**Пр.** *Фядоссі, Івана, Лукі.*

**К.** *Настассі, Розы, Феліксa.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Як мне падказалі, палюбоўніцу ў тэлефоне лепш за ўсё запісваць пад імем «Нумар не вызначаны».**

— Што такое «пайсці па-руску»?

— Доўга развітвацца, выпіць усю гарэлку, застацца начаваць.

**Раздзяваць дзіця, якое спіць, гэта як размініраваць бомбу: адзін рэзкі рух — мінус 4 гадзіны сну.**

— Мілая, я сёння затрымаюся. Мы з хлопцамі сабраліся піва папіць.

— А ну паўтары, сволач!..

— Я пасля працы, кажу, адразу дадому... Сумую.

**Дачка вырасла: раней не хацела вучыцца, цяпер не хоча працаваць.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

## Даты | Падзеі | Людзі

**11 ЧЭРВЕНЯ**

**1811** год — нарадзіўся Вісарыён Бялінскі, рускі пісьменнік, літаратурны крытык, публіцыст, філосаф. Значэнне Бялінскага і яго ўплыў у рускай літаратуры былі вялізнымі і адчуваюцца да гэтага часу. Ён не толькі паказаў той шлях, па якім павінна ісці літаратура, каб стаць грамадскай сілай, але і стаў настаўнікам і кіраўніком маладога пакалення пісьменнікаў. Акрамя літаратурных аглядаў, Бялінскі напісаў выдатныя артыкулы пра Дзяржавіна, Лермантава, Майкова, Паляжаева, Марлінскага, Пушкіна, пра рускую народную паэзію, якія прадстаўляюць поўную гісторыю літаратуры ад Ламаносава да смерці Пушкіна.

**1910** год — нарадзіўся Жак Іў Кусто, французскі акіянограф, пачынальнік падводных даследаванняў і кіназдымак. У 1943 г. выпрабаваў першы прататып акваланга, распрацаваны ім сумесна з Эмілем Ганьянам, што ўпершыню дазволіла праводзіць працяглыя падводныя даследаванні і ў значнай ступені спрыяла паляпшэнню сучасных ведаў аб падводным свеце. Стаў стваральнікам воданепранікальных камер і асвятляльных прыбораў, вынайшаў першую падводную тэлевізійную сістэму. З пачатку 1950-х гадоў вёў акіянаграфічныя даследаванні з дапамогай судна «Каліпса». Прызнанне да яго прыйшло ў 1953 г. з выхадам кнігі «У свеце бязмоўя», напісанай у суаўтарстве з Фрэдэрыкам Дзюма. У 1973 годзе заснаваў некамерцыйнае «Таварыства Кусто» па ахове марскога асяроддзя. Аўтар тэлевізійнага серыяла «Падводная адысея Кусто» і інш.



**1931** год — 85 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Аляксандравіч Мацюхін, беларускі вучоны ў галіне фізіялогіі і біяфізікі, акадэмік НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік АМН СССР, Расійскай АМН, Расійскай АН. Аўтар больш як 300 навуковых прац, прысвечаных праблемам экалогіі, біёнікі, біярытмалогіі, радыяцыйнай медыцыны. Ажыццявіў комплексныя даследаванні па эколага-фізіялагічных і эколага-радыяцыйных праблемах чалавека пасля чарнобыльскай катастрофы.

## Было сказана

**Уладзімір КОРБАН, паэт:**

*Не аднаго на свеце мастака*
*Зазнайства загубіла.*
*Яно для таленту — магіла.*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2320.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 чэрвеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12